УДК 811.161.3

# РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ ВУЧНЯЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**Юрчанка Святлана Аляксандраўна**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
дзяржаўнай установы адукацыі
"Сярэдняя школа № 23 г. Магілёва"
(г. Магілёў, Беларусь)
svetaurcenko518@gmail.com



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*У артыкуле разглядаецца пытанне развіцця маўлення вучняў на ўроках беларускай мовы. Развіццё маўлення з'яўляецца важным накірункам у навучанні і выхаванні Развітая мова сведчыць аб інтэлекце вучняў, з'яўляецца паказчыкам культуры, удасканальвае пісьменнасць. Вынік дзейнасці залежыць ад правільнай арганізацыі форм работы.*

Адна з важных задач сучаснай школы – выхоўваць асобу, вучыць разважаць, граматна пісаць, садзейнічаць развіццю творчых здольнасцей і асэнсаванага маўлення. Вялікую ролю ў развіцці чалавека выконвае слова. Якуб Колас пісаў: "Скрозь адчыненыя дзверы роднай мовы льецца ў школу шырокая, магутная плынь, плынь асветы, людскі розум і пачуцці дзяцей" [2, с. 319].

Развіццё маўлення з'яўляецца важным накірункам пры вывучэнні мовы, бо асноўная яго мэта – навучыць школьнікаў мэтанакіравана і правільна ўжываць моўныя сродкі для прыёму і перадачы неабходнай інфармацыі. З маленства дзеці набываюць першапачатковыя навыкі, але сапраўднае ўдасканаленне мовы адбываецца ў сацыяльным асяроддзі, у зносінах з іншымі людзьмі. Важная задача настаўнікаў – дапамагаць вучням успрымаць разнастайную інфармацыю, вучыць выказваць свае думкі, дзяліцца ўражаннямі, пачуццямі вусна і пісьмова.

Развіваць маўденне дзяцей – гэта значыць так арганізаваць навучальны працэс, каб школьнікі сістэматычна выконвалі разнастайныя моўныя і маўленчыя практыкаванні, якія садзейнічаюць асэнсаванню і засваенню нормаў літаратурнага вымаўлення і правапісу, узбагачаюць слоўнік і актуалізуюць формы слоў, знаёмяць з выяўленчымі сродкамі мовы і яе стылістычнай шматграннасцю, вучаць ствараць разнастайныя па змесце і будове словазлучэнні, сказы, тэксты. Неабходна таксама вучыць школьнікаў працаваць над выяўленнем зместу і формы выказванняў, паказваць ім прыёмы, якія дапамагаюць лагічна, упарадкавана афармляць вусна і пісьмова ўласныя думкі.

Развіваць звязную мову – значыць спалучыць у працы ўсе асноўныя элементы маўлення: змест, лагічнасць выказвання, тэматычную закончанасць, сэнсавую і структурную цэласнасць, дакладнасць, вобразнасць, выразнасць, яснасць, належнае моўнае афармленне, бо ўсе гэтыя кампаненты спалучаюцца ў працэсе перадачы думак.

У працэсе развіцця мовы вучні назапашваюць навыкі правільнага выкарыстання моўных сродкаў:

– інтанацыйна-акцэнталагічныя;

– лексічныя;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

– словаўтваральныя;
– граматычныя;
– марфалагічныя;
– сінтаксічныя;
–стылістычныя.

Адна з важных задач па развіццю мовы – усвядомленае авалоданне моўнымі сродкамі звязнага выказвання. Вырашаецца яна шляхам комплекснай работы пры вывучэнні ўсіх раздзелаў курса “Беларуская мова” [1, с. 109].

Работа па развіццю мовы – гэта фарміраванне ўменняў і навыкаў лагічна будаваць звязнае выказванне, умець ствараць звязаны тэкст.

Таму перш за ўсё неабходна, каб вучні пачыналі работу са знаёмства з паняццем тэкст:
– тэма, асноўная думка;
– падтэмы, падзел на лагічныя часткі;
– сродкі сувязі сказаў у тэксце;
– тыпы маўлення;
– стылі маўленчай дзейнасці [1, с. 109].

Сістэма работы пачынаецца з пачатковых класаў і працягваецца ў кожным класе пры вывучэнні беларускай мовы. Гэта значыць, што вучні замацоўваюць і ўдасканальваюць уменні працаваць над звязаным выказваннем.

Асноўнымі метадамі і прыёмамі работы па развіццю маўлення з’яўляюцца:

– прыёмы функцыянальна-стылістычнай работы з тэкстам: аналіз узораў навуковага, публіцыстычнага, мастацкага, афіцыйнага і гутарковага стыляў, выяўленне характэрных прымет пэўнага стылю; вызначэнне стылістычнай прыналежнасці розных тэкстаў; стварэнне і рэдагаванне ўласных тэкстаў;

– прыёмы работы з тэкстамі розных функцыянальна-сэнсавых тыпаў (апавяданне, апісанне, разважанне): аналіз узораў тэкстаў розных тыпаў, вызначэнне іх прымет, складанне кампазіцыйных схем; складанне ўласных тэкстаў розных тыпаў, увядзенне ў тэксты неабходнай інфармацыі; кампазіцыйная праўка прапанаваных тэкстаў;

– прыёмы работы над жанрамі маўлення: аналіз узораў тэкстаў розных жанраў, падрыхтоўка і напісанне ўласных тэкстаў у жанры нататкі, водгуку, рэпартажу ці фельетона і г.д.;

– прыёмы навучання звязным выказванням: зместава-кампазіцыйны аналіз тэкстаў, аналіз лексіка-граматычных сродкаў, складанне сказаў на аснове апорных слоў, увядзенне ў тэкст сказаў [5, с. 365].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вельмі карысна ўжываць прыёмы, якія накіраваны на мысленне: *гульні, славеснае маляванне па карцінах, складанне дыялогаў, работа з рознымі тыпамі слоўнікаў.*

Найбольш значнымі і карыснымі творчымі работамі па развіццю звязнага маўлення вучняў з'яўляецца пераказ, пераклад, сачыненне.

*Пераказ* – перадача ў вуснай ці пісьмовай форме прачытанага ці праслуханага тэксту, стварэнне тэксту на аснове дадзенага [5, с. 388]. У працэсе падрыхтоўкі і правядзення пераказаў у вучняў выпрацоўваюцца ўменні ўспрымаць змест тэкстаў розных стыляў, тыпаў і жанраў, вызначаць іх тэму і асноўную думку, кампазіцыйную структуру, складаць план выказвання, удасканальваць напісанае і інш. Гэты від работы станоўча ўплывае на ўзбагачэнне лексічнага запасу вучняў, развівае граматычны лад маўлення, удасканальвае арфаграфічную і пунктуацыйную пісьменнасць, садзейнічае фарміраванню ўменняў правільна і мэтанакіравана выкарыстоўваць моўныя сродкі ў адпаведнасці з мэтай і ўмовамі зносін.

У працэсе падрыхтоўкі і правядзенні пераказаў дзеці выпрацоўваюць уменні рабіць аналіз тэксту, выдзяляць галоўнае і другараднае, складаць план выказвання, дакладна перадаваць змест пачутага, убачанага або прачытанага, звязана выказваць думкі.

Такім чынам, пераказ – адзін з традыцыйных эфектыўных сродкаў развіцця звязанага маўлення вучняў [5, с. 396].

У сістэме навучання беларускай мове асаблівае месца займае *пераклад. Пераклад* з адной мовы на другую папаўняе слоўнікавы запас вучняў, удасканальвае веды па граматыцы, садзейнічае больш глыбокаму разуменню структуры роднай мовы. Лінгвістычная аснова *перакладу* – параўнанне фактаў абедзвюх моў. Пераклад дае магчымасць, па-першае, удакладніць, замацаваць і актывізаваць атрыманыя веды на функцыянальнай аснове, па-другое, параўноўвае рознаўзроўневыя факты і з'явы абедзвюх моў, што дазваляе глыбей асэнсаваць найбольш складныя моўныя з'явы, а таксама весці сістэматычную працу па пераадоленні недахопаў [5, с. 409].

Важнае месца сярод творчых работ адводзіцца *сачыненню.*

*Сачыненне* – гэта самастойнае звязанае выказванне вучнямі сваіх думак, пачуццяў, разважанняў, меркаванняў на прапанаваную тэму. Сачыненне больш складаны від работы, таму што патрабуе ад школьнікаў стварэння ўласнага тэксту пэўнага стылю і жанру. Сачыненне характарызуецца творчым падыходам да раскрыцця тэмы, з'яўляецца сродкам самавыражэння асобы вучня, яго жыццёвай пазіцыі, унутраннага свету [5, с. 396].

Работа над сачыненнем развівае ў школьнікаў уменне назіраць, асэнсоўваць, даваць ацэнку ўбачанаму, выказваць уражанні аб прачытаным

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ці пачутым, разважаць, даказваць, супастаўляць і параўноўваць прадметы і з'явы, рабіць высновы. Сачыненне таксама дае магчымасць меркаваць пра веданне вучнямі фактычнага матэрыялу, пра іх уменне карыстацца вобразнымі сродкамі ва ўласным выказванні.

Работа над сачыненнем мае большую магчымасць для самастойнай творчай дзейнасці школьнікаў, для навучання іх звязанай мове.

Адна з важнейшых задач работы па развіццю маўлення – усвядомленае авалоданне моўнымі сродкамі звязанага выказвання. Рашаецца яна шляхам комплекснай работы пры вывучэнні ўсіх раздзелаў курса. Адны раздзелы курса беларускай мовы з' яўляюцца базавымі для развіцця навыкаў выкарыстання пэўнага моўнага сродку ў мове, а іншыя даюць магчымасць арганізаваць трэніровачную работу і далейшае ўдасканаленне дадзенага навыку. На гэтым будуецца этапнасць работы па развіццю мовы, якая мае на ўвазе якаснае змяненне навыкаў пры навучанні.

Розныя віды работы і сістэмны падыход спрыяюць узбагачэнню слоўнікавага запасу вучняў, развіваюць мысленне, удасканальваюць арфаграфічную і пунктуацыйную граматнасць, фарміруюць уменні правільна выкарыстоўваць сродкі мовы ва ўласным выказванні.

Каб абудзіць у вучняў цікавасць да творчай работы, выклікаць жаданне пазнаваць таямніцы роднага слова, развіць уменне самастойна працаваць, неабходна стварыць спрыяльныя ўмовы для дзейнасці. Важная задача настаўніка-філолага – бачыць у дзіцяці асобу з уласнымі думкамі, пачуццямі, з уласным успрыманнем, каб вучні маглі разлічваць на тое, што яго магчымасці будуць улічаны настаўнікам.

**Спіс літаратуры**

1. Выкладанне беларускай мовы ў школе / М. Г. Яленскі, Л. С. Васюковіч, І. М. Саматыя [і інш.]. – Мінск : Народная асвета, 1994. – 239 с.

2. Колас, Я. Методыка роднай мовы // Збор твораў : у 14 т. – Т. 12. [Тэкст] / Я. Колас. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1976. – 457 с.

3. Кухарава, І. А. Схема аналізу мастацкага твора / І. А. Кухарава // Беларуская мова і літаратура. – 2001. – № 1.

4. Ляшчынская, В. А. Навучанне і выхаванне культуры маўлення на ўроках беларускай мовы // Роднае слова. – 1999. – № 7. – С. 100–103.

5. Методыка выкладання беларускай мовы : вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М. Г. Яленскі [і інш. ] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2007. – 448 с.

6. Руцкая, А. В. Жанры творчых прац па літаратуры: рэалізацыя камунікатыўнага навучання // Беларуская мова і літаратура. – 2005. – № 1. – С. 23–26.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова